УДК 902/904(476)

# ВЗГЛЯДЫ ВАНДАЛИНА ШУКЕВИЧА НА СОЦИАЛЬНУЮ РОЛЬ АРХЕОЛОГИЧЕСКОЙ НАУКИ

***А. В. ВАЙТОВИЧ*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Предлагается реконструкция взглядов В. Шукевича на проблему определения места археологии в жизни общества. Ученый не оставил систематизированного изложения своей позиции. Вместе с тем анализ научного, публицистического и эпистолярного наследия В. Шукевича позволяет установить основные тезисы его концепции. Известный археолог стремился привлечь внимание соотечественников к археологическим объектам и призывал обеспечивать их надлежащую охрану. К числу первоочередных задач В. Шукевич относил инвентаризацию археологических памятников. Исследователь понимал важность задачи по созданию общенационального музея, обосновывал использование научных подходов к комплектованию археологических фондов. Он не забывал и о необходимости популяризации знаний о прошлом, предлагая и реализовывая разные формы работы в этом направлении. В. Шукевич рассматривал археологические объекты в качестве важных факторов становления национального самосознания и призывал специалистов к активному участию в общественной жизни.

***Ключевые слова:*** история археологии; теория археологии; популяризация науки; общество; Вандалин Шукевич; Беларусь.

**Образец цитирования:**
Вайтовіч АУ. Погляды Вандаліна Шукевіча на сацыяльную ролю археалагічнай навукі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2022;3:15–23.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2022-3-15-23

**For citation:**
Vaitovich AU. Wandalin Szukiewicz's ideas about the social role of the archaeology. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2022;3:15–23. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2022-3-15-23

**Автор:**
***Александра Владимировна Вайтович*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета.

**Author:**
***Aliaksandra U. Vaitovich***, PhD (history), docent; associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*vaitovich.aliaksandra@gmail.com*

CC BY NC

# ПОГЛЯДЫ ВАНДАЛІНА ШУКЕВІЧА НА САЦЫЯЛЬНУЮ РОЛЮ АРХЕАЛАГІЧНАЙ НАВУКІ

***А. У. ВАЙТОВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Прапануецца рэканструкцыя поглядаў В. Шукевіча на праблему вызначэння месца археалогіі ў жыцці грамадства. Навуковец не пакінуў сістэматызаванага тлумачэння сваёй пазіцыі, аднак аналіз яго навуковай, публіцыстычнай і эпісталярнай спадчыны дазваляе аднавіць асноўныя палажэнні канцэпцыі В. Шукевіча. Адзначаецца, што славуты археолаг дбаў аб прыцягненні ўвагі суайчыннікаў да помнікаў даўніны і заклікаў забяспечваць іх. Да ліку першачарговых задач В. Шукевіч адносіў інвентарызацыю археалагічных помнікаў. Даследчык разумеў важнасць задачы па стварэнні агульнанароднага музея, абгрунтоўваў выкарыстанне навуковых падыходаў да камплектавання археалагічных фондаў. Ён не забываў і аб неабходнасці папулярызацыі ведаў аб мінулым, прапаноўваючы і рэалізуючы розныя формы працы ў гэтым кірунку. В. Шукевіч успрымаў археалагічныя аб’екты ў якасці істотных чыннікаў станаўлення нацыянальнай самасвядомасці і заклікаў адмыслоўцаў да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці.

***Ключавыя словы:*** гісторыя археалогіі; тэорыя археалогіі; папулярызацыя навукі; грамадства; Вандалін Шукевіч; Беларусь.

# WANDALIN SZUKIEWICZ'S IDEAS ABOUT THE SOCIAL ROLE OF THE ARCHAEOLOGY

***A. U. VAITOVICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article is devoted to the reconstruction of W. Szukiewicz’s views on the issue of the role of the archaeology in the society. The scholar didn’t leave the systematic explanation of the thoughts. Nevertheless, the study of his scientific works, newspaper notes and epistolary heritage allows to understand his main theses and ideas. He realised the value of the archaeological sites and artifacts and cared about drawing the attention of the compatriots to the local antiquities. According to W. Szukiewicz the priority should be given to the creation of the archaeological maps. The scholar urged the public to protect the archaeological heritage. He supported the idea of the organisation of the national museum. Moreover, he understood the importance of the scientific approaches to the formation of the museum collections. He kept in mind the popularisation of the archaeological and historical knowledge. W. Szukiewicz interpreted archaeological objects as key factor of the formation of national identity and called the specialists for participation in public life.

***Keywords:*** history of archaeology; theory of archaeology; popularisation of science; Wandalin Szukiewicz; Belarus.

## Уводзіны

На сучасным этапе развіцця гуманітарных ведаў назіраецца паступовае ўзрастанне цікавасці беларускіх спецыялістаў да праблематыкі грамадска-палітычнага кантэксту археалогіі [1–4]. Разам з тым нельга сцвярджаць, што разгляд пытанняў сацыяльнай абумоўленасці гэтай навукі з’яўляецца цалкам новым напрамкам даследчай дзейнасці айчынных адмыслоўцаў. Разважанні на тэмы адносін грамадства да археалагічнай спадчыны, узаемадзеяння шырокіх колаў насельніцтва і археалагічнай супольнасці, а таксама ўзаемадачынення ідэалогіі і археалогіі пачалі публікавацца ўжо ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст.[1] Не застаўся ў баку ад асэнсавання праблемы сацыяльнай ролі археалагічнай навукі і Вандалін Шукевіч (1852–1919).

Шматгранная навуковая і грамадская дзейнасць вядомага археолага неаднаразова асвятлялася на старонках розных па жанры прац[2] [5–10]. Тэарэ-

[1]*Киркор А.* Значение и успехи археологии в наше время // Зап. Вил. археол. комис. Ч. 1. Вильно : Тип. Й. Завадского, 1856. С. 37–38 ; *Сементовский А. М.* Белорусские древности. СПб. : Типо-литар. Н. Стефанова, 1890. С. V–VI, 83–84 ; *Покровский Ф. В.* Археологическая карта Виленской губернии. Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1893. С. V.

[2]*Brensztejn M.* Wandalin Szukiewicz // Ziemia. 1914. No. 15. S. 25–26 ; *Talko-Hryncewicz J. S.* P. Wandalin Szukiewicz // Przegląd Archeol. 1920. Zesz. 3/4. S. 81–83 ; *Śnieżko A.* Uczcijmy pamięć Wandalina Szukiewicza // Ziemia Lidzka. 1939. No 3. S. 73–81 ; *Лаўрэш Л.* Вандалін Шукевіч: беларускі археолаг і краязнаўца. Мінск : Харвест, 2014. 64 с.

тычныя ўстаноўкі славутага ўраджэнца Лідчыны, аднак, дагэтуль не выступалі самастойным прадметам вывучэння. У дадзеным артыкуле прапануецца рэканструкцыя поглядаў В. Шукевіча на праблему вызначэння месца археалогіі ў жыцці грамадства.

Навуковец не пакінуў сістэматызаванага тлумачэння сваёй пазіцыі. Разам з тым аналіз навуковай, публіцыстычнай і эпісталярнай спадчыны В. Шукевіча дазваляе аднавіць асноўныя палажэнні яго канцэпцыі. Варта таксама адзначыць, што пошук адказу на пытанне аб тым, як В. Шукевіч разумеў сацыяльныя функцыі археалогіі, патрабуе папярэдняга асэнсавання метадалагічнай базы адмыслоўца.

## Пытанні тэорыі і метадалогіі археалогіі ў працах В. Шукевіча

У сваіх публікацыях і лістах даследчык неаднаразова закранаў праблемы прыроды археалогіі і яе прадмета. В. Шукевіч нязменна зыходзіў з таго, што археалогія – гэта навука[3].

У 1901 г. ён меркаваў, што археалогія «ахоплівае як усе сляды творчасці чалавека, якія праяўляюцца ў вырабах… так і праявы думкі, якія выкрышталізаваліся ў міфах, звычаях і сацыяльных парадках» (тут і далей пераклад наш. – *А. В.*)[4]. Такая трактоўка прадмета археалогіі знаходзілася ў рэчышчы метадалагічных падыходаў, якія дамінавалі сярод навукоўцаў Расійскай імперыі ў сярэдзіне – трэцяй чвэрці XIX ст. [11, s. 32; 12, с. 79–80, 84; 13, с. 97–99]. Ужо ў канцы XIX ст. шырокае і размытае разуменне археалогіі згубіла падтрымку пераважнай большасці спецыялістаў [14, с. 52–53].

З цягам часу метадалагічныя ўстаноўкі В. Шукевіча карэкціраваліся. Так, у 1906 г., абмяркоўваючы структуру будучага Віленскага музея старажытнасцей, ён прапанаваў уключыць у склад установы не толькі аддзел «антыкаў, сувеніраў і незвычайных рэчаў», але і асобны аддзел, прысвечаны археалогіі і звязаным з ёй навукам. Да іх ліку былі аднесены перадусім прыродазнаўчыя дысцыпліны, а таксама этнаграфія[5]. Такім чынам, даследчык успрыняў новы, пазітывісцкі, падыход да дыферэнцыяцыі навук, накіраваны на вылучэнне самастойных напрамкаў [8, s. 316–317]. Акрамя таго, В. Шукевіч падкрэсліваў выключную значнасць дысцыплін прыродазнаўчага цыкла для археолага. Гэты тэзіс таксама адпавядаў тагачасным навуковым трэндам, якія развіваліся ў рэчышчы эвалюцыянізму [11, s. 79–104; 12, с. 128–137, 147–148].

В. Шукевіч сцвярджаў, што археалогія «займаецца мінулым чалавека ў розных эпохах яго культурнага развіцця»[6], «падаўжае гісторыю ў адлеглыя часы»[7]. Такім чынам, археалогія разглядалася як дысцыпліна гістарычнага цыкла. Акрамя таго, В. Шукевіч падкрэсліваў, што «гісторыя… звяртаецца да тых крыніц, што дае археалогія»[8]. Фактычна археалогіі адводзілася роля крыніцазнаўчай навукі. Уяўленні аб цеснай сувязі археалогіі і гісторыі, прыведзеныя В. Шукевічам, цалкам падзяляліся тагачаснай акадэмічнай супольнасцю [12, с. 79, 102–103]. У апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX ст. распаўсюджваліся ідэі аб крыніцазнаўчым характары археалагічных даследаванняў [12, с. 118; 14, с. 52–53].

Разважаў В. Шукевіч і над адметнасцямі археалагічных крыніц (хаця сам тэрмін не выкарыстоўваў). Навуковец пісаў: «…кожны здабытак – гэта не антыкварыят, якім валодае зацікаўленая публіка, але выраз чалавечай думкі… і апавядае нам шмат»[9]. В. Шукевіч сцвярджаў: «…мова пахаванняў… ніколі не падманвае, ніколі не прадстаўляе перад нашымі вачыма прыдуманых ці недакладных вобразаў»[10]. Са згаданых цытат вынікае, што, на думку вядомага навукоўца, кожная археалагічная знаходка з'яўляецца крыніцай інфармацыі аб мінулым, прычым крыніцай аб'ектыўнай, дакладнай і непрадузятай. Меркаванне аб бясспрэчнай праўдзівасці і аб'ектыўнасці археалагічных крыніц, якое цалкам падзяляў даследчык, склалася ў другой палове XIX ст.[11] і не падвяргалася сумненню да сярэдзіны XX ст. [15, с. 167].

Такім чынам, тэарэтычныя пазіцыі В. Шукевіча адпавядалі духу часу. Выдатна ўсведамляючы каштоўнасць старажытных здабыткаў, славуты ўраджэнец Лідчыны рупліва дбаў аб прыцягненні ўвагі шырокіх колаў грамадства да мясцовай археалагічнай спадчыны.

---

[3]*Szukiewicz W.* Niektóre zabytki przedhistoryczne w powiecie Lidzkim // Księga pamiątkowa na uczczenie setnej rocz. urodzin Adama Mickiewicza (1798–1898). T. 2. Warszawa, 1898. S. 227 ; *On też.* Narzędzia kamienne gładzone w powiatach Lidzkim i Trockim (gub. Wileńska): dokoń. // Światowit. 1904. T. 5. S. 56 ; *On też.* Działy archeologii przedhistoricznej oraz etnografii w Muzeum // Rocz. t-wa przyjaciół nauk w Wilnie. 1908. T. 2. S. 134–135.

[4]*On też.* Szkice z archeologii przedhistorycznej Litwy. Cz. 1 : epoka kamienna w gub. Wileńskiej. Wilno : Księg. J. Zawadzkiego, 1901.S. 5.

[5]*On też.* Museum w Wilnie // Kurjer Lit. 1906. 3 (16) paźdz. No. 223 (324). S. 1.

[6]*On też.* Szkice z archeologii przedhistorycznej Litwy… S. 5.

[7]*On też.* Ślady epoki kamiennej w gub. Wileńskiej // Kwart. Lit. 1910. T. 1. S. 48.

[8]*On też.* W kwestji krajoznawstwa // Kurjer Lit. 1907. 10 (23) sierp. No. 176. S. 1.

[9]*On też.* Działy archeologii przedhistoricznej oraz etnografii w Muzeum… S. 135.

[10]*On też.* Ślady epoki kamiennej w gub… S. 49.

[11]*Забелин И. Е.* Опыты изучения русских древностей и истории: исследования, описания и критические статьи: публицистика. Ч. 2. М. : Тип. Грачева и К°, 1873. С. 81.

## Погляды В. Шукевіча на адносіны грамадства да археалагічных помнікаў

В. Шукевіч хацеў высветліць, хто цікавіцца мінулым. Сам ён з прыкрасцю адказваў на гэтае пытанне так: «Толькі адзінкі, чые намаганні зразумець штосьці сярод імглы несвядомасці настолькі недастатковыя, што немагчыма іх аб'яднаць у нейкую агульнасць»[12]. Пераважнай большасці суграмадзян, на думку навукоўца, была ўласціва «дзіўная абыякавасць да спраў, што не прыносяць адразу карысці»[13]. Прычым непавага да помнікаў даўніны, па меркаванні даследчыка, была характэрна для ўсіх слаёў грамадства.

В. Шукевіч з болем адзначаў, што ў значнай ступені да знішчэння археалагічных аб'ектаў мелі дачыненне сяляне. Ён пісаў: «Сёння па костках, пакладзеных на вечны спачынак, праходзіць саха аратага, які нават не здагадваецца, што прафануе рэшткі сваіх прадзедаў. Канешне, у памяці народа не захаваўся нават след паданняў, каму належалі пахаванні. Іх звыкла называюць татарскімі ці шведскімі, таму ніхто не адчувае дакораў сумлення, калі знішчае іх з неразважлівай цікавасці або з хціваcці да кавалка зямлі»[14]. Навуковец адзначаў і тое спецыфічнае шанаванне, з якім народ адносіўся да так званых перуновых стрэл – выпадкова знойдзеных каменных і крамянёвых сякер. «У некаторых ваколіцах краю свята вераць у лекавыя ўласцівасці каменных сякерак і скрабуць іх на лекі... Таму не раз здаралася, што ў пэўнай мясцовасці ў літаральным сэнсе саскрэбвалі на лекі ўсе сякеры, якія атрымалася адшукаць, так што праз вякі нават слядоў ад іх не засталося»[15].

На старонках прац В. Шукевіча моцна крытыкавалася і стаўленне прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя і інтэлігенцыі да археалагічных знаходак: «Рэдка хто умее ацаніць іх [артэфакты] належным чынам. Таму ў большасці выпадкаў яны ўпрыгожваюць салон (калі трапляюць у заможны дом) або туляцца па закутках і гарышчах шляхецкіх сядзібак, адкуль праз пасрэдніцтва гандляроў, што ўмеюць... дацягнуцца да ўсяго, разыходзяцца па свеце»[16]. Даследчык падкрэсліваў, што такія аматары старажытнасцей, «шчодра аплачваючы кожную рэч, якая трапляе ў іх рукі, робяць гэта для задавальнення... фантазіі, але абсалютна не клапоцяцца аб карысці для навукі»[17].

В. Шукевіч імкнуўся аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю ў сваім родным краі. Ён прызнаваў, што ўзнікаюць навуковыя таварыствы, адчыняюцца музеі, якія карыстаюцца падтрымкай грамадства[18]. У будучыню, аднак, славуты археолаг глядзеў без аптымізму: «Ёсць розніца паміж тым, каб падтрымліваць справу дзейсна, сваёй працай ці капіталам, і тым, каб аддаць рэчы лішнія або такія, якім не надаецца значэння»[19]. З гэтым, на думку спецыяліста, і была звязана адна з ключавых праблем: «Імкнучыся развіваць якую-небудзь дзейнасць, хаця б упарадкаваць музей, ужо не кажучы пра навуковыя даследаванні, трэба мець грошы. Але грамадства іх выдаткоўваць не спяшаецца»[20].

## Уяўленні В. Шукевіча аб напрамках працы археалагічнай супольнасці

Даследчык меркаваў, што вывучэннем археалогіі «павінны заняцца навуковыя таварыствы, людзі добрай волі і ўсе, хто любіць мінулае»[21]. На працягу свайго навуковага жыцця ён разважаў, якія канкрэтныя праблемы павінны вырашаць «ахвотныя працаваць на гэтым жніве»[22]. Аналіз публікацый дазволіў вылучыць пяць задач, пастаўленых навукоўцам, і ахарактарызаваць прапанаваныя ім спосабы іх вырашэння.

**Інвентарызацыя археалагічных помнікаў.** В. Шукевіч сцвярджаў: «Ад гэтага павінны пачаць, таму што самі не ведаем, чым валодаем»[23].

Ідэя падрыхтоўкі агульнанацыянальнага рэестра археалагічных помнікаў у канцы XIX – пачатку XX ст. была надзвычай актуальнай. Першыя заходы ў гэтым кірунку былі зроблены ў 1850-я гг. на тэрыторыі Германіі і Чэхіі [16, s. 238]. У 1860-я гг. праблема неабходнасці стварэння археалагічных карт была ўзнята і ў Расійскай імперыі [17, с. 277]. Рэалізацыяй праекта спачатку займаліся сябры Маскоўскага археалагічнага таварыства, заснаванага ў 1864 г. [16, s. 242]. Першыя метадычныя набыткі – рэкамендацыі па ўпарадкаванні легендаў карт – былі складзены Д. М. Анучыным да VI Археалагічнага з'езда ў Адэсе, які адбыўся ў 1884 г. [18, s. 171]. Планавалася стварыць агульную археалагічную карту Расійскай імперыі, аднак амбіцыйныя задачы так і не былі выкананы. У 1890-я гг. выйшлі ў свет толькі карты помнікаў асобных, пераважна заходніх, губерняў краіны.

[12] *Szukiewicz W.* Zaniedbane niwa // Kurjer Lit. 1908. 31 lip. (13 sierp.). No. 174. S. 1.
[13] Tamże.
[14] *Szukiewicz W.* Niektóre zabytki przedhistoryczne w powiecie Lidzkim... S. 227.
[15] *On też.* Narzędzia kamienne gładzone... S. 9–10.
[16] *On też.* Zaniedbane niwa... S. 1.
[17] *On też.* Narzędzia kamienne gładzone... S. 56.
[18] *On też.* W kwestji krajoznawstwa... S. 1.
[19] Tamże.
[20] Tamże.
[21] *Szukiewicz W.* Ślady epoki kamiennej w gub. Wileńskiej... S. 61.
[22] *On też.* W kwestji krajoznawstwa... S. 1.
[23] *On też.* W sprawie naszych zabutkow // Kurjer Lit. 1909. 6 (19) lut. S. 2.

В. Шукевіч неаднаразова праводзіў уласныя палявыя археалагічныя даследаванні. Акрамя таго, ён удзельнічаў у «археалагічнай экскурсіі» па Віленскай губерні, арганізаванай сябрам Маскоўскага археалагічнага таварыства У. І. Сізавым з нагоды падрыхтоўкі да IX археалагічнага з'езда ў Вільні[24]. В. Шукевіч займаўся і сістэматызацыяй Археалагічнага інвентару Ковенскай губерні [19, s. 95, 97]. Дасведчаны навуковец прызнаваў: «…праца тая… занадта вялікая для аднаго чалавека, хіба што ён пойдзе па слядах Пакроўскага ці Татура, якія для сваіх археалагічных карт… збіралі звесткі пры дапамозе паліцыі і гмінных улад. Такі падыход да справы не прыносіць ніякай карысці для навукі»[25]. Па меркаванні адмыслоўца, для належнай рэалізацыі праектаў па інвентарызацыі археалагічных помнікаў Літвы і Беларусі трэба было б запрашаць і навукоўцаў, і ўсіх адукаваных аматараў мінуўшчыны[26].

З аналагічнымі праблемамі сутыкаліся ўсе тагачасныя спецыялісты, зацікаўленыя ва ўліку старажытнасцей: прафесійных археолагаў не хапала, а наватарскія планы па складанні археалагічных карт былі незразумелымі для шырокай грамадскасці. Таму галоўныя спадзяванні па зборы і ўпарадкаванні інфармацыі аб помніках мінуўшчыны акадэмічная і ўніверсітэцкая супольнасці Расійскай імперыі ўскладалі на мясцовых добраахвотных памочнікаў [16, s. 239; 20, c. 135].

Выдатна разумеючы асаблівасці арганізацыі айчыннай навукі, В. Шукевіч падкрэсліваў, што даследаванні, накіраваныя на выяўленне і рэгістрацыю археалагічных аб'ектаў, павінны працягвацца не адзін дзясятак год[27]. Імкнучыся садзейнічаць практычнай рэалізацыі гэтай важнай задачы, навуковец нават апублікаваў у часопісе для моладзі «Pobudka» інструкцыю па «інвентарызацыі помнікаў далёкага мінулага»[28].

**Ахова археалагічнай спадчыны.** В. Шукевіч быў упэўнены: «…усё, што нам тое мінулае нагадвае аб светлых і хвалебных баках… мы павінны ахоўваць»[29]. І ў той жа час ён з жалем адзначаў: «…калі існуюць яшчэ якія рэшткі, то толькі дзякуючы нечуванай іх вытрываласці, бо ў нас робіцца ўсё, каб іх знішчыць, але не каб падтрымаць»[30].

Клопат аб захаванні старажытных помнікаў успрымаўся навукоўцам як адзін з істотных чыннікаў належнага функцыянавання грамадства. «Паглядзім на замежжа, – пісаў ён, – на тое, як там кожны здабытак шануецца і зберагаецца, як кожны звычайны жыхар разумее значнасць усяго, пра што яму прыгадвае мінулае. У нас, наадварот, калі ўсё пойдзе цяперашнім чынам… праз няшмат гадоў край наш будзе ўяўляцца сапраўднай *tabula rasa*, на якой кожная рука будзе пісаць тое, што захоча, таму што ў нас не будзе аніякіх падстаў супярэчыць нават самай відавочнай хлусні»[31].

В. Шукевіч не абмяжоўваўся дэкларацыямі, але рупліва клапаціўся аб ахове старажытнасцей. У 1899 г. славуты археолаг узначаліў нефармальнае віленскае кола аматараў археалогіі, этнаграфіі, краязнаўства і мастацтва Літвы, вядомае як археалагічны гурток. Таемная арганізацыя, створаная ў 1898 г., існавала да 1907 г. На працягу ўсяго гэтага часу сябры гуртка імкнуліся выратаваць руіны Тракайскага замка ад поўнага знішчэння. Лідарам у гэтай справе быў В. Шукевіч[32]. У 1902 г. вядомы даследчык атрымаў згоду Пецярбургскай археалагічнай камісіі на правядзенне даследаванняў і ажыццяўленне рамонту ў замку. В. Шукевіч распачаў аднаўленне помніка, якое працягвалася і пазней – на працягу амаль усяго XX ст. [6, s. 265–266; 10].

Не заставаліся па-за ўвагай навукоўца і пытанні рэстаўрацыі Лідскага замка. В. Шукевіч неаднаразова наведваў муры замка Гедыміна і апублікаваў шэраг нататак з суровай крытыкай праведзеных на помніку работ па аднаўленні руін[33].

**Стварэнне агульнанароднага музея і развіццё музейнай археалогіі.** Самааддана займаючыся кансерватарскімі работамі, В. Шукевіч не забываў і аб іншых кірунках дзейнасці. Надзённай задачай ён лічыў назапашванне калекцый археалагічных артэфактаў. Даследчык падкрэсліваў неабходнасць занатоўваць самыя найменшыя дробязі, што датычацца здабыткаў[34]. Пры гэтым славуты археолаг бачыў пільную патрэбу не толькі ў стварэнні звычайных музеяў, але і перадусім у заснаванні адмысловай «святыні для навукі»[35].

Пасля зачынення ў 1865 г. царскімі ўладамі музея старажытнасцей, заснаванага Я. П. Тышкевічам [21, с. 81–85], на Віленшчыне, як і на тэрыторыі сучаснай Беларусі, установы такога ўзроўню адсутнічалі. У 1906 г. у Вільні пачало сваю дзейнасць

[24]Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1893. С. 82, 92, 96–100.
[25]*Szukiewicz W.* W kwestji krajoznawstwa… S. 1.
[26]Tamże.
[27]Tamże.
[28]*Szukiewicz W.* Inwentaryzowanie zabytków odległej przeszłości // Pobudka. 1910. No. 6. S. 20–25.
[29]*On też.* Zamek Trocki // Kalendarz il. «Kurjera Lit.» na rok 1909. Wilno, 1908. S. 213.
[30]*On też.* Zwaliska zamku w Lidzie // Kurjer Lit. 1910. 26 czerw. (9 lip.). No. 142. S. 2.
[31]*On też.* W sprawie naszych zabutkow… S. 2.
[32]*On też.* W zamku Trockim // Kurjer Lit. 1906. 23 lut. (8 marca). No. 44. S. 2 ; *On też.* W zamku Trokach // Tamże. 17 (30) grud. No. 286. S. 1.
[33]*On też.* Zwaliska zamku w Lidzie… S. 2 ; *On też.* Zamek w Lidzie // Ziemia. 1911. No. 46. S. 748–749.
[34]*On też.* Narzędzia kamienne gładzone… S. 56.
[35]*On też.* Museum w Wilnie… S. 1.

таварыства музея навукі і мастацтва. В. Шукевіч увайшоў у склад яго сяброў, але, не маючы ўпэўненасці ў прафесіяналізме кіраўніцтва таварыства, удзельнічаць у стварэнні музея адмовіўся [6, s. 269–270]. Больш прыхільна ён паставіўся да дзейнасці віленскага таварыства сяброў навук, заснаванага ў тым жа годзе. Гэтая суполка таксама стала ініцыятарам арганізацыі новага музея. В. Шукевіч не пагадзіўся заняць прапанаваную яму пасаду захавальніка, але перадаў у зборы свае калекцыі і пачаў апекавацца над аддзелам дагістарычнай археалогіі [6, s. 271–272; 8, s. 316–317].

Даследчык неаднаразова дзяліўся з чытачамі газеты «Kurjer Litewski» сваімі разважаннямі над ідэяй стварэння музея старажытнасцей. Гэтае «наймілейшае дзіця літоўскіх археолагаў»[36] уяўлялася яму не зборам кур'ёзаў, а навуковай установай, якая «асвятляе цэлы край»[37]. Адпаведна, музей не павінен быў нагадваць «разнавіднасць склада, дзе кожны можа аглядаць згрувашчаныя разам матэрыялы з раскопак і антыкварныя рэчы, кераміку літоўскую і этрускую, гістарычныя рарытэты і вырабы старажытных майстроў і г. д.»[38]. На думку В. Шукевіча, аддзел археалогіі неабходна было вылучыць у асобную структурную адзінку. Фонды гэтага аддзела прапаноўвалася фарміраваць перадусім з калекцый, атрыманых у выніку навуковых даследаванняў. Гэтыя зборы меркавалася дапаўняць высокаэстэтычнымі, але малаінфарматыўнымі прадметамі, што паходзілі з прыватных калекцый[39].

В. Шукевіч быў упэўнены, што працаваць у музеі павінны выключна кваліфікаваныя спецыялісты. Згодна з яго планамі ў аддзеле археалогіі павінны былі захоўвацца калекцыі як айчынных старажытнасцей, так і артэфактаў, сабраных у самых розных рэгіёнах. Дасведчаны археолаг добра разумеў вартасць такіх знаходак – «матэрыялаў, каштоўных для параўнаўчых даследаванняў»[40].

У гэтым музейным праекце знайшлі ўвасабленне асноўныя тэарэтычныя погляды В. Шукевіча. Яны, як ужо адзначалася, цалкам адпавядалі перадавым ідэям таго часу. Памкненні даследчыка абапіраліся не на прынцыпы антыкварыянізму, але на навуковыя падыходы да камплектавання археалагічных фондаў музея таксама з'яўляліся прагрэсіўнымі [8, s. 316–317].

**Папулярызацыя ведаў аб мінулым.** В. Шукевіч не заставаўся ў баку ад і справы папулярызацыі навукі. Ён сцвярджаў: «Належыць заўсёды пачынаць справы *ab ovo*, ад таго, што складае падставы разумовага развіцця чалавека, ад пазнання таго, што нас акружае і, адпаведна, павінна цікавіць»[41].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу і развіцця шматлікіх навуковых дысцыплін па ўсёй Еўропе назіраўся рост зацікаўленасці грамадства ў распаўсюджванні рацыянальных ведаў. У адпаведнасці з ідэаламі асветніцтва меркавалася, што прапаганда навуковых дасягненняў павінна была перадусім павышаць агульны культурны ўзровень розных сацыяльных груп [22; 23]. Варта таксама ўлічваць, што ў адпаведнасці з разуменнем тагачаснай інтэлігенцыі папулярызацыя навукі была непарыўна звязана з самаадукацыяй [22, s. 61–62]. Пры гэтым менавіта самастойнаму набыццю ведаў адводзілася ключавая роля ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў-археолагаў. У 1901 г. рэдактар часопіса «Światowit» Е. Маеўскі так ахарактарызаваў актуальны стан археалагічнай адукацыі: «Археалогія, як навука, якая яшчэ нядаўна нідзе не выкладалася, палягае і заўсёды будзе палягаць галоўным чынам на самастойнай працы, на самаадукацыі. Кожны, хто распачынае даследаванні, павінен самастойна вывучаць тэму. Таму выключна практыка, веданне літаратуры і захапленне навуковай праблемай робяць з недасведчаных аматараў-археолагаў… тых, хто мае права голасу»[42].

Імкнучыся данесці да сваіх суайчыннікаў ідэі аб каштоўнасці археалагічных артэфактаў і помнікаў, В. Шукевіч прапаноўваў і рэалізоўваў розныя формы папулярызацыі ведаў. На працягу свайго навуковага жыцця ён ахвотна супрацоўнічаў з рэдакцыямі перыядычных выданняў Варшавы («Wiek», «Tygodnik ilustrowany», «Kłosy», «Ziemia»), Вільні («Kurjer Litewski», «Rocznik towarzystwa przyjaciół nauk», «Pobudka»), Санкт-Пецярбурга («Kwartalnik Litewski») і інш. Клапаціўся В. Шукевіч і аб падрыхтоўцы навукова-папулярнай літаратуры. Так, у 1905 г. ён працаваў над прызначаным для шырокіх колаў грамадства «падручнікам па археалогіі» [19, s. 80]. З'яўляючыся сябрам шэрага таварыстваў, даследчык рэгулярна выступаў з дакладамі на археалагічную тэматыку [6, s. 276; 8, s. 321]. Вялікае значэнне ён надаваў і краязнаўчым экскурсіям: «Такія выезды хаця і не могуць даць такіх жа моцных уражанняў, якія дае замежжа, тым не менш могуць задаволіць кожнага… каму патрэбна не толькі забава, але і пашырэнне сваіх ведаў»[43].

[36] *Szukiewicz W*. Museum w Wilnie… S. 1.
[37] *On też*. W kwestji krajoznawstwa… S. 1–2.
[38] *On też*. Museum w Wilnie… S. 1.
[39] Tamże.
[40] Tamże.
[41] *Szukiewicz W*. Nauka czy cztyka // Dz. Wilenski. 1906. 8 (21) grud. No. 84. S. 1.
[42] *On też*. Poszukiwania archeologiczne w pow. Lidzkim i Trockim (gub. Wileńska) // Światowit. 1901. T. 3. S. 3.
[43] *On też*. W kwestji krajoznawstwa… S. 2.

**Грамадска-палітычная дзейнасць**[44]. В. Шукевіч сцвярджаў, што «археалогія ў прынцыпе мае заданне вывучаць толькі мінулае» [19, s. 109]. Аднак ён успрымаў помнікі не проста як «кнігі, якія нам даюць уяўленні аб мінулым жыцці»[45]. Старажытныя пахаванні, руіны і іншыя археалагічныя здабыткі трактаваліся навукоўцам менавіта як нацыянальныя старажытнасці, якія могуць распавесці аб самых ранніх этапах гісторыі народа. Ідэя аб нацыятворчай ролі ведаў аб аддаленых эпохах праходзіла чырвонай ніткай праз усю навуковую і публіцыстычную творчасць адмыслоўца.

У 1907 г. на старонках газеты «Kurjer Litewski» В. Шукевіч так ахарактарызаваў сітуацыю, якая склалася на яго родных абшарах: «Літвіны прад'яўляюць свае правы на гэтую зямлю… Супраць паўстаюць палякі, спасылаючыся на свае гістарычныя правы. Расіяне наўпрост, карыстаючыся правам моцнага, не робяць высілкаў прывесці хоць адзін аргумент, але вядуць несвядомага беларуса за руку і кажуць верыць, што Літва – гэта край "исконно русский"»[46]. У такіх умовах, на думку навукоўца, «усё, што… мінулае нагадвае светлага і хвалебнага, павінна быць для нас каштоўнай рэліквіяй»[47]. Пры гэтым старажытнасцям адводзілася роля не маўклівых сведкаў гісторыі, але крыніцы інфармацыі, запатрабаванай грамадствам. В. Шукевіч пісаў: «…у нашым становішчы мінулае павінна быць настаўнікам, правадыром, які паказвае шляхі будучыні. На гэтым фундаменце павінны будаваць дом нашага будучага лёсу»[48].

Такія ўльтрапатрыятычныя адносіны да археалагічнай спадчыны пачалі фарміравацца ў шэрагу краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ўжо ў першай палове – сярэдзіне XIX ст. [25, p. 365–367]. Успрыманне археалагічных здабыткаў у якасці перадусім нацыянальных старажытнасцей стала распаўсюджвацца ў Расійскай імперыі, у тым ліку на землях былой Рэчы Паспалітай, у 1850–70-я гг. [11, s. 42–43; 12, с. 68–69]. На мяжы XIX–XX стст. падыход, звязаны з успрыманнем археалагічных матэрыялаў як крыніц па гісторыі ўласнага народа і накіраваны на абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, перажываў сапраўдны росквіт і ў заходне-, і ва ўсходнееўрапейскай навуцы [26, с. 50].

В. Шукевіч сцвярджаў: «Хоць археалогія мае заданне вывучаць толькі мінулае, гэта не значыць, што археолагі не могуць… звяртаць свае думкі ў будучыню» (цыт. па: [19, s. 109]). Памкненні да грамадска-палітычных змен, на думку даследчыка, павінны былі рэалізоўвацца ў двух напрамках. З аднаго боку, В. Шукевіч падкрэсліваў важнасць задачы па захаванні і асэнсаванні археалагічнай спадчыны. Ён пісаў: «…для нас мінулае тым больш павінна быць дарогай, бо толькі ў ім можам чэрпаць сілы для барацьбы за існаванне народа»[49]. З іншага боку, славуты навуковец выступаў і за дзейсную зацікаўленасць у актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця. Ён не сумняваўся: «…павінен нас да гэтага заахвоціць момант, які перажываем, які… можа нарэшце ўцягнуць кожнага ў надзвычай шырокую сферу сацыяльнай актыўнасці» [19, s. 109]. Даследчык заклікаў: «Нам, археолагам (сябрам археалагічнага гуртка, старшынёй якога з'яўляўся В. Шукевіч. – *А. В.*), належыць выказаць свае пачуцці адносна нашага незабыўнага мінулага. Мы абавязаны… стаць плячо да пляча ў шчыльным шэрагу на абарону нашых народных інтарэсаў» [19, s. 110].

Варта заўважыць, што для славутага ўраджэнца Лідчыны згаданыя словы не з'яўляліся абстрактнымі разважаннямі. Ён паслядоўна і актыўна выяўляў сваю грамадзянскую пазіцыю. Сяброўства са шматлікімі грамадска-культурнымі таварыствамі, публіцыстычная дзейнасць, арганізацыя ў Начы і ваколіцах школ для вясковых дзяцей, стварэнне земляробчага гуртка, заснаванне гміннай рады – вось няпоўны пералік разнапланавых дасягненняў В. Шукевіча, якія атрымалі належную ацэнку яго біёграфаў [9; 10].

## Заключэнне

Цяжка пераацаніць след, які пакінуў В. Шукевіч у беларускай археалогіі. Яго навуковыя і публіцыстычныя творы, напісаныя ў канцы XIX – пачатку XX ст., сёння прачытваюцца па-новаму.

Выбітны даследчык і руплівец археалагічных старажытнасцей выразна акрэсліў шляхі асваення айчыннай археалагічнай спадчыны. Ён імкнуўся да абуджэння шырокіх слаёў насельніцтва, заахвочваў усіх «людзей добрай волі»[50] збіраць інфармацыю аб помніках мінуўшчыны і клапаціцца аб захаванні гістарычных помнікаў. Пры гэтым, відавочна, В. Шукевіч не лічыў археалогію вежай са слановай косткі.

[44]Высвятленне грамадска-палітычных поглядаў В. Шукевіча выходзіць па-за межы артыкула. Тым не менш варта адзначыць наступнае. Славуты археолаг лічыў сябе палякам (Гл.: *Szukiewicz W.* O oświatę białoruską // Kurjer Lit. 1908. 27 sierp. (9 wrześ.). No. 196. S. 1). На думку даследчыкаў, ён прытрымліваўся ці сімпатызаваў так званай ідэі краёвасці [6, s. 277–278]. Гэтая ідэалогія сфарміравалася ў часы грамадска-палітычных пераўтварэнняў, выкліканых рускай рэвалюцыяй 1905–1907 гг. Сутнасць краёвай ідэі пры ўсіх рознагалоссях заключалася ў тым, што беларуска-літоўскія землі разглядаліся як адмысловае тэрытарыяльнае, эканамічнае і культурнае цэлае – край, што гістарычна сфарміраваўся ў межах ВКЛ. Важнымі прынцыпамі краёвай ідэі з'яўляліся раўнапраўе нацый, якія насялялі гэтыя абшары, а таксама агульнае змаганне за інтарэсы краю [24, с. 198–205].

[45]*Szukiewicz W.* Nieco z archeologii Litwy // Kurjer Lit. 1907. 1 (14) wrześ. No. 194. S. 1.

[46]Tamże.

[47]*Szukiewicz W.* Zamek Trocki… S. 213.

[48]Tamże.

[49]*Szukiewicz W.* Zwaliska zamku w Lidzie… S. 2.

[50]*On też.* Ślady epoki kamiennej w gub. Wileńskiej… S. 48.

Асветніцкая дзейнасць, папулярызацыя ведаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці – гэтыя напрамкі працы адмыслоўцаў усведамляліся ім як надзвычай істотныя. Нельга не прызнаць, што высновы славутага археолага і сёння не згубілі сваёй актуальнасці.

На жаль, застаюцца злабадзёнымі і перасцярогі ўладальніка маёнтка ў Начы. Ён пісаў: «Належыць спяшацца з ацаленнем для навукі той рэшты помнікаў, якая застаецца, таму што яшчэ трошкі, і можа быць позна»[51]. Навуковец заклікаў: «Хутчэй за працу, бо могуць нас апярэдзіць тыя, хто па сваіх палітычных матывах зацікаўлены ў скажэнні нашага мінулага»[52].

Адказнасць за вырашэнне задач, сфармуляваных больш чым сто год таму, ляжыць на сучаснай археалагічнай супольнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Крывальцэвіч ММ. Археалёгія і палітыка. *Шуфляда.* 1999;1:33–55.
2. Крывальцэвіч ММ. Інтэрпрэтацыя археалагічнай спадчыны і палітычная канфліктнасць. В: Артюшевская СВ, составитель. *Интерпретация культурного наследия и развитие туризма в Беларуси.* Вильнюс: ЕГУ; 2006. с. 18–24.
3. Краўцэвіч А. Археалогія і палітыка. *Arche.* 2013;2:140–145.
4. Лобач УА. Курганы, гарадзішчы, скарбы: «вясковая археалогія» на тэрыторыі Віцебшчыны ў XIX–XX стст. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні.* 2017;4:10–39.
5. Каханоўскі АГ. *Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст.* Мінск: Навука і тэхніка; 1984. 120 с.
6. Zasztowt L. Wileńscy miłośnicy «starożytności» w latach 1899–1914. *Kwartalnik historii nauki i techniki.* 1990;35(2–3): 259–284.
7. Blombergowa MM. W sprawie towarzystw naukowych działajacych w Wilnie w XIX i poczatku XX wieku. *Kwartalnik historii nauki i techniki*. 1992;37(1):69–87.
8. Wrońska J. Wokól towarzystwa przyjaciól nauk w Wilnie. *Archeologia Polski.* 1992;37(1–2):315–322.
9. Zabiela G. Vandalinas Šukevičius – akmens amžiaus gyvenviečių tyrinėtojas (150-ųjų gimimo metinių sukakčiai pažymėti). *Lietuvos archeologija*. 2002;23:9–28.
10. Бломберг ММ. *Вандалін Шукевіч. Сын лідскай зямлі – даследчык і грамадскі дзеяч.* Варшава: Таварыства польскай культуры на Лідчыне; 2010. 80 с.
11. Abramowicz A. *Historia archeologii polskiej XIX i XX wiek.* Warszawa: Instytut historii kultury materialnej PAN; 1991. 206 s.
12. Платонова НИ. *История археологической мысли в России. Вторая половина XIX – первая треть XX века.* Санкт-Петербург: Нестор-История; 2010. 316 с.
13. Лебедев ГС. *История отечественной археологии. 1700–1917 гг.* Санкт-Петербург: Издательство СПбГУ; 1992. 464 с.
14. Клейн ЛС. *История российской археологии: учения, школы и личности. Том 1. Общий обзор и дореволюционное время*. Санкт-Петербург: Евразия; 2014. 704 с.
15. Клейн ЛС. *Археологическое исследование. Методика кабинетной работы археолога. Книга 1.* Донецк: ДНУ; 2012. 622 с.
16. Szczerba A. Mapy archeologiczne zachodnich guberni Imperium Rosyjskiego. W: Konopska B, Ostrowski J, redactorzy. *Z dziejów kartografii. Tom XVIII*. Warszawa: Wydawnictwo Instytutu historii nauki PAN; 2014. s. 237–250.
17. Мусин АЕ, Носов ЕН, редакторы. *Императорская археологическая комиссия (1859–1917): к 150-летию со дня основания. У истоков отечественной археологии и охраны культурного наследия.* Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин; 2009. 1192 с.
18. Blombergowa MM. O najstarszych polskich mapach archeologicznych. *Kwartalnik historii nauki i techniki.* 1992; 37(2):151–172.
19. Wiech S, redactor. *Nieznane listy z Ziem Zabranych. Kresy w Polskich pamiętnikach i listach (1795–1918). Tom 3.* Kielce: Wydawnictwo Uniwersytetu Jana Kochanowskiego; 2016. 256 s.
20. Щавелёв СП. Горизонты и тупики исторического краеведения в России. В: Гладышев АВ, редактор. *История и историческая память. Выпуск 12*. Саратов: Саратовский государственный университет; 2015. с. 134–155.
21. Алексеев ЛВ. *Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в.* Минск: Белорусская наука; 1996. 206 с.
22. Zasztowt L. Popularyzacja nauki w Królestwie Polskim na tle dyskusji teoretycznych przełomu XIX w. *Rozprawy z Dziejów Oświaty*. 1983;25:59–92.
23. Wrona G. Polskie czasopisma popularnonaukowe w XIX wieku. Ewolucja formy i treści. *Rocznik historii prasy Polskiej.* 2007;2:5–31.
24. Марозаў СП. *Ідэя адраджэння Вялікага Княства Літоўскага ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1795–1939 гг.)*. Гродна: ЮрСаПрынт; 2019. 446 с.
25. Díaz-Andreu M. *A World history of nineteenth-century archaeology: Nationalism, Colonialism, and the past.* Oxford: Oxford University Press; 2007. 486 p.
26. Платонова НИ. Истоки санкт-петербургской школы археологии (конец XIX – первая треть XX в.: Н. П. Кондаков, В. Р. Розен, А. А. Спицын, Ф. К. Волков, А. А. Миллер). В: Вишняцкий ЛБ, Ковалев АА, Щеглова ОА, редакторы. *Археолог: детектив и мыслитель*. Санкт-Петербург: Издательство СПбГУ; 2004. с. 43–73.

[51]*Szukiewicz W.* Niektóre zabytki przedhistoryczne w powiecie Lidzkim… S. 227.
[52]*On też.* Inwentaryzowanie zabytków odległej przeszłości… S. 25.

## References

1. Kryval'cjevich MM. [Archaeology and politics]. *Shufljada*. 1999;1:33–55. Belarusian.
2. Kryval'cjevich MM. [Interpretation of archaeological heritage and political conflict]. In: Artyushevskaya SV, compiler. *Interpretatsiya kul'turnogo naslediya i razvitie turizma v Belarusi* [Interpretation of cultural heritage and development of tourism in Belarus]. Vilnius: European Humanities University; 2006. p. 18–24. Belarusian.
3. Krawcevich A. [Archaeology and politics]. *Arche.* 2013;2:140–145. Belarusian.
4. Lobach UA. [Mounds, settlements, treasures: «rural archaeology» in Vicebsk region in 19th–20th centuries]. *Belaruski fal'klor: matjeryjaly i dasledavanni.* 2017;4:10–39. Belarusian.
5. Kakhanouski AG. *Arhealogija i gistarychnae krajaznawstva Belarusi w XVI–XIX stst.* [Archeology and historical local studies in Belarus in 16th–19th centuries]. Minsk: Navuka i tjechnika; 1984. 120 p. Belarusian.
6. Zasztowt L. Wileńscy miłośnicy «starożytności» w latach 1899–1914. *Kwartalnik historii nauki i techniki.* 1990;35(2–3): 259–284.
7. Blombergowa MM. W sprawie towarzystw naukowych działajacych w Wilnie w XIX i poczatku XX wieku. *Kwartalnik historii nauki i techniki*. 1992;37(1):69–87.
8. Wrońska J. Wokól towarzystwa przyjaciól nauk w Wilnie. *Archeologia Polski.* 1992;37(1–2):315–322.
9. Zabiela G. Vandalinas Šukevičius – akmens amžiaus gyvenviečių tyrinėtojas (150-ųjų gimimo metinių sukakčiai pažymėti). *Lietuvos archeologija*. 2002;23:9–28.
10. Blombergowa MM. *Wandalin Szukiewicz. Syn Ziemi Lidzkiej – Badacz i Społecznik (1852–1919).* Warsaw: Towarzystwo Kultury Polskiej Ziemi Lidzkiej; 2010. 80 p. Polish.
11. Abramowicz A. *Historia archeologii polskiej XIX i XX wiek.* Warszawa: Instytut historii kultury materialnej PAN; 1991. 206 s.
12. Platonova NI. *Istoriya arkheologicheskoi mysli v Rossii. Vtoraya polovina XIX – pervaya tret' XX veka* [History of archaeological thought in Russia. Second half of the 19th – first third of the 20th century]. Saint Petersburg: Nestor-Istoriya; 2010. 316 p. Russian.
13. Lebedv GS. *Istoriya otechestvennoi arkheologii. 1700–1917 gg.* [History of domestic archaeology. 1700–1917]. Saint Petersburg: Publishing house of St. Petersburg University; 1992. 464 p. Russian.
14. Klein L. *Istoriya rossiiskoi arkheologii: ucheniya, shkoly i lichnosti. Tom 1. Obshchii obzor i dorevolyutsionnoe vremya* [History of Russian archeology: research directions, schools and personalities. Volume 1. General overview and pre-revolutionary times]. Saint Petersburg: Eurasia; 2014. 704 p. Russian.
15. Klein LS. *Arkheologicheskoe issledovanie. Metodika kabinetnoi raboty arkheologa. Kniga 1* [Archaeological research. Methodology of desk studies of the archaeologist. Book 1]. Donetsk: Donetskii natsional'nyi universitet; 2012. 622 p. Russian.
16. Szczerba A. Mapy archeologiczne zachodnich guberni Imperium Rosyjskiego. W: Konopska B, Ostrowski J, redactorzy. *Z dziejów kartografii. Tom XVIII*. Warszawa: Wydawnictwo Instytutu historii nauki PAN; 2014. s. 237–250.
17. Musin AE, Nosov EN, editors. *Imperatorskaya arkheologicheskaya komissiya (1859–1917): k 150-letiyu so dnya osnovaniya. U istokov otechestvennoi arkheologii i okhrany kul'turnogo naslediya* [*Imperial Archaeological Commission (1859–1917): on the occasion of the 150th anniversary of its founding. At the origins of domestic archeology and the protection of cultural heritage*]. Saint Petersburg: Dmitry Bulanin; 2009. 1192 p. Russian.
18. Blombergowa MM. O najstarszych polskich mapach archeologicznych. *Kwartalnik historii nauki i techniki.* 1992; 37(2):151–172.
19. Wiech S, redactor. *Nieznane listy z Ziem Zabranych. Kresy w Polskich pamiętnikach i listach (1795–1918). Tom 3.* Kielce: Wydawnictwo Uniwersytetu Jana Kochanowskiego; 2016. 256 s.
20. Shchavelyov SP. [Horizons and deadlocks of local history in Russia]. In: Gladyshev AV, editor. *Istoriya i istoricheskaya pamyat'. Vypusk 12* [History and historical memory. Issue 12]. Saratov: Saratov State University; 2015. p. 134–155. Russian.
21. Alekseev LV. *Arkheologiya i kraevedenie Belarusi XVI v. – 30-e gody XX v.* [Archeology and local history of Belarus in the 16th century – 1930s]. Minsk: Belorusskaya nauka; 1996. 206 p. Russian.
22. Zasztowt L. Popularyzacja nauki w Królestwie Polskim na tle dyskusji teoretycznych przełomu XIX w. *Rozprawy z Dziejów Oświaty*. 1983;25:59–92.
23. Wrona G. Polskie czasopisma popularnonaukowe w XIX wieku. Ewolucja formy i treści. *Rocznik historii prasy Polskiej.* 2007;2:5–31.
24. Marozaw SP. *Idjeja adradzhjennja Vjalikaga Knjastva Litowskaga w gramadska-palitychnym zhycci Belarusi (1795–1939 gg.)* [The idea of reviving of the Grand Duchy of Lithuania in the socio-political life of Belarus (1795–1939)]. Hrodna: JurSaPrint; 2019. 446 p. Belarusian.
25. Díaz-Andreu M. *A world history of nineteenth-century archaeology: nationalism, colonialism, and the past.* Oxford: Oxford University Press; 2007. 486 p.
26. Platonova NI. [The origins of the Saint Petersburg school of archeology (the end of the 19th century – the first third of the 20th century: N. P. Kondakov, V. R. Rosen, A. A. Spitsyn, F. K. Volkov, A. A. Miller)]. In: Vishnyatskii LB, Kovalev AA, Shcheglova OA, editors. *Arkheolog: detektiv i myslitel'* [Archaeologist: detective and thinker]. Saint Petersburg: Izdatel'stvo SPbGU; 2004. p. 43–73. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 20.05.2022.*
*Received by editorial board 20.05.2022.*